# *Знаёмцеся:* ДАНІЛА ШЫЛА

## (Куток сатыры і гумару)

Ранняй вясною ўсё навакол ажывае, адраджаецца. Сонца весялей песціцца ў лужынах. Шпарчэй імчаць аўтобусы, распырскваючы на сустрэчны люд цэлыя каскады прыдарожнай гразі. Байчэй зачырыкалі вераб'і. Прырода шалее ад радасці, рвецца насустрач жыццю.

Абрадаваўся і студэнт. Канец зіме! Бывайце, сумныя аўдыторыі і доўгія лекцыі! Студэнт больш не пазяхае. Ён усё радзей і радзей ходзіць на заняткі. Вясна кліча да сябе, прывабна усміхаецца вільготнымі тратуарамі. І што студэнту да таго, што выкладчыкі ў адчаі хапаюцца за галовы, што дэканы начамі не спяць, прыдумваючы, як павысіць наведваемасць лекцый. Вясна. Што зробіш? Яна зрабіла свой уплыў на беларускае і рускае аддзяленні філфака, на юрыстаў і журналістаў малодшых курсаў. Знізілася наведваемасць лекцый. Старасты ставяць у курсавых журналах суквецці «двоек». Журналы нібы ажываюць, шапацяць спісаннымі старонкамі.

Ажылі і нашы універсітэцкія паэты. Зашапацелі задушэўнымі лірычнымі вершамі. «Вясна, вясна... Ты любая, ты добрая», — захістаўся верш Анатоля Сербантовіча. Верш п'яны, як і аўтар. Вясна... Усё хмялее ў галаве. Пачуццяў столькі, што без паўлітра не разбярэшся. І Анатоль, каб разабрацца, прыкладваецца паэтычнымі вуснамі да цудадзейнага напітка Бахуса. П'е. Цягне з яго ўсю асалоду зямную. Хораша! Душа гуляе ад радасці. Язык хоць і заплятаецца, але часам выкіне такое слоўца, што аж інтэрнат па вуліцы Свярдлова чырванее. Ды што інтэрнат? Няхай прывыкае. Трэба ж даць маладосці разгуляцца!

Аб гэтым вам скажа і стары ваш знаёмы Даніла Шыла. Не памятаеце? А жаль... У мінулыя гады ён некаторым здорава насаліў, падсыпаў у настрой столькі перцу, што ад яго чыхалі многія.

Адна мая знаёмая нават скардзілася: «Хутчэй бы ён скончыў універсітэт і ўбіраўся адсюль, гэты Даніла Шыла».

І так атрымалася, што словы дзяўчыны трапілі ў самую кропку. Даніла Шыла знік, замоўк. Ні слыху, ні дыху не было аб ім. А гэтай вясной ён зноў ажыў. Прыйшоў у нашу рэдакцыю і заявіў: «Я Даніла Шыла, смяюн, гаварун, люблю ва ўсім парадак і не цярплю недахопаў. Магу быць вострым сатырыкам і вясёлым гумарыстам. Раблю тое самае, што і мае старэйшыя браты «Кракадзіл», «Вожык», «Дзед Міхед», «Мяцёлка» і іншыя — змагаюся з усім адмоўным. Біяграфія мая кароткая — студэнт усіх курсаў, усіх факультэтаў. Факты, адмоўныя і смешныя, збіраю сам і чакаю іх ад студэнтаў, ад чытачоў газеты «Беларускі універсітэт».

Паслухалі ў рэдакцыі Данілу Шылу і згадзіліся: быць яму на старонках газеты. Спадзяёмся, што і чытачам спадабаецца наш Даніла Шыла, што ўсе актыўна будуць пісаць у наш куток сатыры і гумару.

# На прыз газеты „Беларускі універсітэт"

## Фізікі выходзяць наперад

Апошнія два туры з'явіліся трыумфам каманды фізічнага факультэта. З разгромным лікам 5:0 яны выйграюць у філолагаў і нанеслі паражэнне моцнай камандзе 2 курса матэматычнага факультэта з лікам 3,5: 2,5. Каманда фізікаў зноў заблішчэла на шашачным гарызонце. Напорыстая, мэтанакіраваная ігра іх дае ўсе шансы стаць пераможцам у спаборніцтве. У гэтым вялікая заслуга Маісеенкі, здолеўшага арганізаваць каманду з маладых ігракоў.

Асноўным канкурэнтам фізікаў з'яўляецца каманда 3 курса матфака, якая з лікам 4:2 перамагла каманду вылічальнага цэнтра.

У нядзелю адбудзецца сустрэча матэматыкаў з фізікамі, якая павінна рашыць многае.

Неспартыўныя паводзіны некаторых ігракоў каманды хімфака, другога прызёра каманднага першынства універсітэта, пакінулі непрыемнае ўражанне: пасля пройгрыша ў першым туры Паляшчук і Грыневіч перасталі з'яўляцца на ігры. Шашачны клуб не павінен ліберальнічаць з імі, ён павінен прыняць суровыя меры да іх.



**На здымку: студэнтка 2 курса біялагічнага факультэта Ванда Кулікоўская.**

**Як і некалькі яе аднакурснікаў, яна грамадскі кантралёр па праверцы работы прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Яна ўжо ўдзельнічала ў праверцы работы кафэ «Тэатральнае» і дыетычнай сталовай, што па Ленінскім праспекце ля Батанічнага саду.**

# ГОЛАС У ЭФІРЫ

Мне пашанцавала: Аляксандра Загорца я знайшоў дома. А гэта мала каму ўдаецца. Таму што гэты чалавек вельмі няўрымслівы. Ён усюды хоча паспець. Сярод многіх грамадскіх абавязкаў у яго і работа рэдактара радыёгазеты інтэрната № 4. На вучобу таксама патрэбна шмат часу. І ўсё ж. у яго, студэнта 3 курса юрыдычнага факультэта, парадак на ўсіх франтах.

Я зайшоў у пакой, дзе жыве Аляксандр. І паколькі ні з кім з яго жыхароў не быў знаёмы, спытаў Аляксандра.

— Я, — устаючы з крэсла, чотка адказаў высокі юнак.

Мы пазнаёміліся.

Аляксандр як раз рыхтаваў чарговы нумар радыёгазеты. А гэта не так троста. У рэдакцыю паступаюць розныя матэрыялы. Іх трэба апрацаваць так, каб атрымаўся жывы матэрыял, каб ён «добра слухаўся», як выражаецца сам Аляксандр. Таму і патрэбна вялікая стараннасць. Нездарма ж радыёгазета інтэрната па вуліцы Дзімітрава лічыцца адной з лепшых. Заўсёды перадаюцца змястоўныя, цікавыя матэрыялы. Добра асвятляюцца жыццё студэнтаў, іх адпачынак, вучоба.

Рэгулярна, раз у тыдзень, у эфіры гучаць галасы дыктараў Людмілы Койфман і Леаніда Ваўчка. Усяго ў рэдакцыі на грамадскіх пачатках працуюць 13 чалавек, якія прадстаўляюць геаграфічны, фізічны, матэматычны, біялагічны, юрыдычны, хімічны факультэты. Гэта Уладзімір Хасяневіч, Валянцін Дземянюк, Уладзімір Каравай і іншыя. Вельмі дружны творчы калектыў.

Я папрасіў Аляксандра паказаць матэрыялы мінулых нумароў радыёгазеты. Ён тут жа дастаў спецыяльную папку, дзе захоўваюцца стосы напісанных ад рукі і надрукаваных на машынцы лістоў. Матэрыялы — адзін цікавей другога.

Вось карэспандэнцыя, якая ішла пад рубрыкай «Нашы маякі». Вось замалёўка, якая расказвае аб трэцякурсніку юрфака Генадзію Кашукову. Генадзь з'яўляецца выдатнікам вучобы і служыць прыкладам для сваіх аднакурснікаў. Апошнюю сесію ён здаў на «выдатна». І цяпер у яго зноў напружаныя дні: падрыхтоўка да наступнай экзаменацыйнай сесіі.

Аляксандр паказвае заметку аб вучэбнай практыцы студэнтаў біяфака. Гаворыцца ў ёй аб студэнтках Касінскай і Каруновай, якія добра вучацца. І вось цяпер, на практыцы, яны зарэкамендавалі сябе з выдатнага боку, прагна цягнуцца да ведаў, адзначае газета. Малайцы, дзяўчаты!

Радыёгазета рэгулярна асвятляе таксама пытанні быту, спорту, культуры.

— А каб нумар газеты не быў сумным, — расказвае Аляксандр, —мы выступаем са сваімі канцэртамі, адмовіўшыся ад грампласцінак.

Выяўлены і свае выдатныя спевакі: Віктар Цімашэнка і Леанід Дамашэўскі, які сам піша і музыку. На словы студэнткі Акучжавы ён напісаў песню «Далоні» і выконваў па радыё сам. Кожны, хто слухаў гэтую песню, застаўся ўдзячны выканаўцы за за падарунак. А хто ведае, можа, яе возьме з сабою на канікулы студэнт, і яна прагучыць у вёсцы і ў горадзе гэтак жа, як па радыё інтэрната.

У заключэнне мы прагледзелі план работы рэдкалегіі радыёгазеты, што складзены на квартал. Па ўсяму відаць, што гэта вынік калектыўнай працы. Гэта значыць, што калектыў радыёгазеты сам жыве бурным жыццём і, нібы ў люстэрку, адлюстроўвае бурнае жыццё інтэрната.

К. КАНУС.



**Знаёмы малюнак? У вестыбюлі універсітэта працуе тэатральная каса. Адначасова распаўсюджваннем білетаў у БДУ займаюцца актывісты. А чаму б гэтую справу не перадаць поўнасцю ў рукі грамадскіх распаўсюджвальнікаў?**

# Прызы ўручаны

*Закончыўся наш конкурс на лепшую назву зімоваму здымку А. Войды. Перад журы конкурсу стаяла вельмі складаная задача: з 18 назваў, якія далі здымку 20 удзельнікаў конкурсу, выбраць лепшы. Журы доўга спрачалася, абараняла лепшыя назвы, але да адзінай думкі не прыйшло.*

*Журы рашыла ўзнагародзіць не аднаго пераможцу конкурсу, а двух. Большасцю галасоў першы прыз — альбом рэпрадукцый беларускіх мастакоў «Беларускі жывапіс» — быў прысуджаны студэнту 2 курса вячэрняга аддзялення журналістыкі Валянціну Мысліўцу за назву «Халодны квецень». У альбоме — 67 рэпрадукцый лепшых твораў беларускіх мастакоў.*

*Другі прыз — кнігу — журы конкурсу прысудзіла студэнту 1 курса аддзялення журналістыкі Казіміру Канусу за назву «Цішыня».*

*Выказваліся прапановы прысудзіць прыз назвам «Зіма-прыгажуня» І. Макаловіча, «Зіма-паэтэса» І. Капыловіча, «Зімовыя летуценні» П. В. М., але яны не атрымалі падтрымкі.*

*Прызы ўручаны пераможцам.*

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА

Адрас рэдакцыі:
Мінск Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 04231. Тыр. 2000. Зак. 1105.